СТАРЫЙ ЗАМОК
выпускается с 2000 года
Информационный бюллетень Быховщины
20(66)
ФЕВРАЛЬ
2014

Большасць быхаўчан жыве, імкнучыся як мага менш перасякацца з “клапатлівай” дзяржавай, а выбарныя ігрышчы, якія ўладкоўвае рэжым, ім наогул да лямпачкі

Падчас збору подпісаў выбарнікаў давялося гутарыць з людзьмі, якія ахвотна дзяляліся сваім бачаннем агульнабеларускіх і мясцовых праблем.

Варта падкрэсліць адразу: дзяленне на чорнае і белае, у гэтым сэнсе, спрэс адсутнічае. Нельга сказаць, што народ беззапаветна кахае апазіцыю, а да ўлад ставіцца з глыбокой ненавісцю.

Адносіны “ўлада-народ-апазіцыя” значна складаней. Так, напрыклад, сярод быхаўчан знаходзяцца тыя, хто верыць у добрага цара, якога злыя службоўцы не інфармуюць пра праўдзівае становішча спраў на месцах.

Гэта катэгорыя ўпэўнена ў тым, што ў маштабных зменах Беларусь патрэбы не мае, мы крочым дакладным шляхам, застаецца толькі “пашырыць і паглыбіць” ужо зробленае. Гаворка ідзе пра ахвяр прапаганды дзяржаўнага тэлебачання, а таксама пра старых і бабульках, якія памятаюць дзядулю Сталіна.

- Галоўнае, каб не было вайны, - кажуць яны. - Паглядзіце, што дзеецца на Майдане, палюбуйцеся, у якім глыбокім крызісе знаходзіцца Еўразвяз… А ў нас усё больш ці меней у парадку. Чым не дасягненне?

Гэтыя таварышы будуць удзельнічаць у выбарах, шчыра мяркуючы, што змогуць на штосьці паўплываць сваімі галасамі.



Другая праслойка насельніцтва наладжана куды як радыкальней. Яе прадстаўнікі ўсведамляюць усю недасканаласць нашай дыктатуры і спадзяюцца на змены. Зрэшты, удзельнічаць у набліжэнні гэтых самых змен асабіста не спяшаюцца - разлічваюць на дапамогу актывістаў з вялікіх гарадоў ці на ўмяшанне еўрапейскай супольнасці. Гэтыя людзі чытаюць “Хартыю-97”, “Беларускі партызан” і люта крытыкуюць беларускі рэжым… на кухнях.

- Чаму апазіцыя нічога не робіць?! - абураюцца радыкалы. - Трэба аб’яднацца, агітаваць, змагацца!

Трэцюю, даволі вялікую групу складае чыноўніцтва. Яно беззапаветна аддана рэжыму, выступае за стабільнасць. Праўда, толькі датуль, пакуль атрымлівае свой кавалачак ад дыктатарскага пірага. Любых праяў іншадумства асцерагаецца, паколькі бачаць у іх пагрозу ўласнаму дабрабыту. У “выбарах” яно ўдзельнічае, як фальсіфікатар.

Чацвёртая і самая шматлікая катэгорыя быховчан (каля васьмідзесяці адсоткаў) выдатна ўсведамляе ўсё, што адбываецца вакол. Ні ў якія “выбары” не верыць, а на светлай будучыні Беларусі даўно паставіла крыж. Дадзеная група жыве паралельна дзяржаве. П’е на сто рублёў, здаве бутэлек на дзвесце, прыстасоўваючыся да таго, што, па яе меркаванні, нельга змяніць. Гэты тып быхаўчан не паддаецца агітацыі ні з боку дзяржавы, ні з боку апазіцыйных структур.

- Ды пайшлі вы ўсё! - усклікаюць яны. - Не трэба нам дапамагаць - толькі не замінайце!

Такіх не патрабуецца схіляць да байкоту выбараў - яны даўно перасталі на іх хадзіць. Байкот для іх натуральная з’ява. Менавіта дзеля гэтай катэгорыі насельніцтва, якой усё глыбока фіялетава, і адменены ніжні парог яўкі на выбары.

Такі расклад на сёння. Даводзіцца з сумам канстатаваць: вялікага аптымізму ён не выклікае, а вясёлкавых надзей не ўсяляе. Вызначыць яго можна адным словам - інэртнасць.

Сяргей Антонаў

В НОМЕРЕ:



БЫХАЎ: СЯРГЕЙ АНТОНАЎ СКАРДЗІЦЦА НА НЕДОБРАСУМЛЕННАСЦЬ КАНКУРЭНТАЎ

Прэтэндэнт у кандыдаты ў дэпутаты Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў па Быхаўскай гарадской выбарчай акрузе №14, сябар Партыі БНФ Сяргей Антонаў кажа пра тое, што чальцы ініцыятыўных груп праўладных прэтэндэнтаў у кандыдаты даводзяць да выбаршчыкаў непраўдзівую інфармацыю.

"Пры зборы подпісаў за сваю кандыдатуру я пастаянна сутыкаюся з тым, што выбаршчыкі мне кажуць пра тое, што, маўляў, "яны ўжо прагаласавалі", бо падпісаліся за іншага прэтэндэнта ў кандыдаты, - распавядае Сяргей Антонаў. – Прычым гэта не іх асабістае меркаванне. Выбаршчыкі спасылаюцца, што да іх ужо заходзілі сябры ініцыятыўнай групы таго ці іншага з праўладных кандыдатаў, бралі подпіс і папярэджвалі, што за іншых прэтэндэнтаў падпісвацца нельга. Гэта значыць, казалі свядомую няпраўду. Прычым, гэты своеасаблівы прыём выкарыстоўваюць чальцы дзвюх ініцыятыўных груп маіх канкурэнтаў. Пасля іх "тлумачэння" Выбарчага кодэкса вельмі цяжка пераканаць выбаршчыкаў, што гэта няпраўда.

Магу дакладна сказаць, што пра такую "тлумачальную" працу чальцоў ініцыятыўных груп маіх апанентаў мне расказвалі выбаршчыкі ў дзесяці розных кватэрах па вуліцы Грышына ў Быхаве, я для сябе пазначаў нумары гэтых кватэр. Сёння я буду працягваць збор подпісаў на іншых вуліцах і, калі падобныя выпадкі будуць паўтарацца, буду думаць над тым, каб рыхтаваць адпаведную скаргу ў акруговую выбарчую камісію".

Акрамя ініцыятыўнай групы Сяргея Антонава, у акруговай камісіі Быхаўскай гарадской выбарчай акругі №14 зарэгістраваны ініцыятыўныя групы па вылучэнні кандыдатамі ў дэпутаты Магілёўскага аблсавета дырэктара СЗАТ "Белатміт" Барыса Цыпорына, дырэктара ОСП "Грудзінаўскі завод харчовых прадуктаў" (спіртзавода) Віталія Каваленкі і актывісткі "Гавары праўду" Таццяны Буланавай.

Па інфармацыі карэспандэнта "Вясны", ініцыятыўная група Таццяны Буланавай збор подпісаў выбаршчыкаў не вядзе.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Мясникович обеспокоен обреченностью на селе

Премьер Беларуси Мясникович недоволен результатами работы в сельском хозяйстве и выражает беспокойство пессимистичными настроениями сельских работников.

На заседании Президиума Совета Министров Мясникович подчеркнул, что потенциал молочного производства использован не полностью, хоть отрасль и является рентабельной.

«Потребности рынка в молочной продукции гораздо больше. Отечественная молочная отрасль могла бы активизироваться и занять свободные ниши», — передает слова премьера БелТА.



При этом премьер отметил, что результаты работы в АПК «плохие у всех». «Что меня больше всего беспокоит — это некий пессимизм или даже обреченность, которая начинает появляться на селе. Этого быть не должно», — заявил Мясникович.

Основной причиной низкой эффективности работы предприятий сельского хозяйства он назвал недостаток квалифицированных кадров. Руководители регионов, в свою очередь, констатировали, что многие в АПК оказались не готовы работать в новых условиях реконструкции молочно-товарных ферм, которые оснащаются современным оборудованием. Чиновники также отметили неспособность руководителей выстроить работу на перспективу.

Мясникович предложил улучшить ситуацию, повысив ответственность за невыполнение показателей и доведенных заданий. «Сегодня надо выработать и утвердить зоны ответственности, потому что уговоры уже не помогают», — сказал премьер.

Он напомнил, что республиканская программа развития молочной отрасли на 2010-2015 годы предполагает выход на производство 10 млн. т молока в год, а численность поголовья коров должна составить 1 млн 600 тыс. «Осталось два года, а мы имеем совершенно не те показатели», — сказал руководитель правительства, добавив, что только за 2011-2013 годы в сельское хозяйство вложено 5 млрд. долларов, из которых более 2 млрд. пошло на молочно-товарные фермы.



ЗА 2013 ГОД НАТОРГОВАЛИ НА МИНУС 1,7 МИЛЛИАРДА ДОЛЛАРОВ

Отрицательное сальдо внешней торговли товарами и услугами за прошлый год составило рекордные 1 723,8 млн. долларов.

Для сравнения, в 2012 году сальдо было положительным и превышало 3,0234 миллиарда долларов США, сообщает пресс-служба Нацбанка Беларуси.

Катастрофическое падение сальдо внешней торговли связано с прекращением контрабанды так называемых растворителей и разбавителей, под видом которых Беларусь беспошлинно поставляла на внешние рынки российскую нефть, бензин и дизельное топливо.

Внешнеторговый оборот товаров и услуг в 2013 году по предварительным данным составил 89 464,4 млн. долларов (для сравнения - в 2012 году было 100 796,2 млн. долларов).

Экспорт товаров и услуг сократился с 51 909,8 в 2012 году до 43 870,3 млн. долларов в 2013 году, импорт - с 48 886,4 до 45 594,1 млн. долларов.

В 2013 году сальдо внешней торговли товарами упало до минус 4 561,9 млн. долларов (плюс 565,4 млн. долларов в 2012 году), а сальдо внешней торговли услугами выросло до 2 838,1 млн. долларов (в 2012 году было 2 458,0 млн. долларов).

ИНОСТРАНЦЫ ДОЛЖНЫ ПОМНИТЬ, ЧТО НАШЕ НАЦИОНАЛЬНОЕ БЛЮДО - ДРАНИК

В Год гостеприимства для Минторга имеет большое значение тема национальной белорусской кухни, отметила Ирина Наркевич 10 февраля на пресс-конференции в Минске, пишет БелаПАН.

“Сегодня в республике 200 объектов общественного питания имеют белорусскую кухню. В Минске работают 58 ресторанов и кафе, где 80% меню — белорусская кухня. В 2013 году в стране открылись 10 объектов с национальным меню, в том числе в Минске — четыре”, - сказала она.

Наркевич опровергла слухи о том, что Министерство торговли обязывает кафе и рестораны вводить в меню белорусские блюда.

“Мы никого не заставляем, это всего лишь рекомендация, — сказала она. — У нас существуют разные национальные кухни: и итальянская, и японская, и китайская, что как раз говорит о развитии сферы питания в стране. Но мы не должны забывать о позиционировании нашей белорусской кухни. Рекомендованный нами список из 10 блюд создан для того, чтобы иностранец, уехав из Беларуси, запомнил, что национальное белорусское блюдо — это не борщ, а драники. Ресторанам японской или китайской кухни вводить эти блюда необязательно, а вот пиццерия для разнообразия может предложить какой-то белорусский вариант”.

ЛАТУШКО: БЕЛОРУССКАЯ ТЕХНИКА ЛОМАЕТСЯ ПРЯМО НА ПРЕЗЕНТАЦИЯХ

Посол Беларуси во Франции Павел Латушко в эфире программы «Контуры» телеканала ОНТ заявил, что белорусские диппредставительства за рубежом не могут решать проблему экспорта, поскольку это задача самих производителей. Да и как торговый советник или посол может внушить доверие к



белорусской технике, если она просто ломается на презентациях?

«Есть такие примеры, когда в посольства поступают письма с информацией на одной страничке, в которой значится, что на наших складах находится столько-то штук двигателей или столько-то штук телевизоров, или столько-то штук других деталей. И это просто подается в форме штук и экземпляров. Пожалуйста, продайте в вашей стране», — рассказал он.

По его словам, рассчитывать на то, что за предприятия, которых в стране тысячи, задачи экспорта решит один торговый советник или один посол, сложно. «Не потому что мы не хотим работать, а просто потому, что 24 часа в сутках», — отметил Латушко.

«Мы встречаемся с ситуацией, когда наша техника на презентациях просто ломается. И, конечно же, какое может быть доверие к той продукции, которая на первой же презентации может поломаться? Если ключ от единицы нашей техники не может открыть дверь. Можете себе представить, человек покупает Mercedes, берет ключ и дверь этого Mercedes открыть не может. Конечно, мы не продаем Mercedes, но уже сегодня, если мы говорим про сельскохозяйственное машиностроение, покупатель ждет Mercedes на поле», — констатировал Латушко.

ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ!
ГАЗЕТУ «СТАРЫЙ ЗАМОК»
У ЭЛЕКТРОННЫМ ВЫГЛЯДЗЕ ЧЫТАЙЦЕ НА СТАРОНЦЫ
www.kamunikat.net/staryj_zamok.html



АЛЯКСЕЙ ЯНУКЕВІЧ: СЯБРЫ ПАРТЫІ БНФ ВЫЛУЧАНЫЯ КАНДЫДАТАМІ ВА ЎСІХ РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ

10 лютага скончылася вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты на выбарах мясцовых саветаў, якія адбудуцца 23 сакавіка. Сябры Партыі БНФ вылучаныя кандыдатамі ва ўсіх абласьцях Беларусі і ў Менску, пры гэтым яны вылучаюцца ў саветы ўсіх магчымых узроўняў – ад сельсаветаў да абласных саветаў і Менскага гарадзкога савета. Агульная колькасьць вылучаных ад партыі кандыдатаў – каля 80 чалавек.

- Партыя БНФ прымае шырокі ўдзел у гэтай выбарчай кампаніі. Мы не разглядаем яе як паўнавартасную выбарчую кампанію, і гэтую нашую ацэнку падцьвярджае той факт, што нашых прадстаўнікоў масава не ўключылі ў выбарчыя камісіі, не дапусьцілі да падліку галасоў. Аднак Партыя БНФ выкарыстоўвае магчымасьці, якія дае сытуацыя выбараў, для распаўсюду палітычнай альтэрнатывы і агітацыі на карысьць нацыянальна-дэмакратычных каштоўнасьцяў.

Большасьць сяброў Партыі БНФ вылучаюцца ад зарэгістраваных партыйных структураў – абласных і гарадзкіх арганізацыяў. Адзначу, што праз пастаянныя адмовы ў рэгістрацыі на дадзены момант ня маюць легальнага статуса абласныя арганізацыі Партыі БНФ на Магілёўшчыне і на Гарадзеншчыне. У гэтых абласьцях адзіным шляхам вылучэньня магчымым было вылучэньне праз збор подпісаў.

На этапе збору подпісаў працавалі 40 ініцыятыўных групаў у падтрымку вылучэньня сяброў Партыі БНФ, а 10 ініцыятыўным групам было адмоўлена ў рэгістрацыі. Ініцыятыўная групы шырока ладзілі пікеты супраць замежнай вайсковай прысутнасьці ў Беларусі. Усяго ў межах адзінага дня пікетаў супраць расейскіх базаў, што адбыўся 26 студзеня, пікеты прайшлі ў 17 гарадах. Мы будзем і надалей, у тым ліку ў гэтай выбарчай кампаніі, працаваць ў накірунку супрацьстаяньня пагрозе ператварэньня нашай беларускай зямлі ў крамлёўскі вайсковы пляцдарм, – паведаміў Аляксей Янукевіч.

На давыбарах дэпутата Палаты прадстаўнікоў па Навабеліцкай акрузе ў Гомелі Партыя БНФ з ініцыятывы абласной партыйнай арганізацыі падтрымала кандыдатару Галіны Краўчанкі, якая здолела акумуляваць вакол сабе падтрымку шэрагу палітычных і грамадзкіх структураў у Гомелі.

“У Гомелі адбываецца сапраўды моцная кампанія, і я ўсьцешаны, што гарадзкая арганізацыя Партыі БНФ бярэ ў гэтай кампаніі чынны ўдзел, з’яўляючыся часткай сапраўднай эфэктыўнай мясцовай кааліцыі”, – сказаў Аляксей Янукевіч.

- Паколькі на этапе збору подпісаў пятая частка нашых ініцыятыўных групаў не была зарэгістраваная, можна чакаць дастаткова вялікага адсеву і на этапе рэгістрацыі кандыдатаў. У кожным разе мы будзем выкарыстоўваць і надалей ўсе магчымасьці ў часе агітацыйнай кампаніі. Мы плянуем выпуск партыйных агітацыйных матэрыялаў і правядзеньне мітынгаў з выкарыстаньнем паведамляльнага парадку, які распаўсюджваецца на сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі і дазваляе пазьбегнуць забаронаў, зь якімі звычайна сутыкаецца правядзеньне масавых мерапрыемстваў у Беларусі.

Наступным важным этапам для нас будзе сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці. У бліжэйшыя дні Партыя БНФ ініцыюе скліканьне шырокага аргкамітэту Дня Незалежнасьці-2014. На ім мы мяркуем ня толькі дамовіцца зь іншымі палітычнымі суб’ектамі пра фармат акцыі, але і выпрацаваць агульнае зьмястоўнае напаўненьне.

Партыя БНФ прапануе ў гэтым годзе зрабіць акцэнт на найбольш актуальных палітычных тэмах, правесьці акцыю пад лёзунгамі за незалежную Беларусь у сямі вольных народаў Эўропы, супраць расейскіх вайсковых аб’ектаў, супраць уступленьня Беларусі ў Эўразійскі Зьвяз, за вызваленьне палітвязьняў, – адзначыў палітык.

БЕЛАРУСЬ СТАВИТ РЕКОРДЫ ПО РОСТУ ЦЕН НА КАРТОФЕЛЬ

Беларусь, где картофель является фактически национальным продуктом питания, по итогам 2013 года показала самый высокий рост цены, и продолжает ставить рекорды в 2014 году.

Согласно данным Национального статистического комитета Беларуси индекс потребительских цен на товары и услуги в январе 2014 года по сравнению с декабрем 2013 года составил 101,6%. При этом самый значительный рост в цене опять продемонстрировала группа продовольственных товаров – плюс 2,3% всего за один месяц, в которой одну из лидирующих позиций снова занял белорусский картофель, пишет «Ежедневник».

Так, согласно данным Белстата, только за январь средняя цена на картофель выросла в Беларуси выросла на 9%. А если сравнивать с показателем января 2013 года, то рост цены на картофель поставил абсолютный рекорд – плюс 91,8%. Даже ближайший «конкурент» в лице пшеничной муки прибавили в цене всего на 49,9%.

Правда, если брать чисто январь 2014, то картофель обошли овощи - плюс 14,6%, и табачные изделия, которые показали рост в 15,9%. Однако эти два ближайших конкурента все равно находятся вне конкуренции белорусского картофеля. Первый лишь продемонстрировал кратковременный сезонный рост цены, а второй – итог госрегулирования. Если же брать в расчет объективные экономические показатели, то картофель был и остается безусловным лидером по росту цен в картофельной стране.



У КОЛХОЗОВ КОНФИСКОВЫВАЮТ ТРАКТОРА ИЗ-ЗА ПЬЯНЫХ РАБОТНИКОВ

Два сельхозпредприятия в Гомельской области лишились своей техники. По сведениям областной ГАИ, у пьяных водителей-«повторников» в области уже конфискованы 19 автомобилей. 86 арестованы, по ним ожидается решение суда. Как выяснилось, в этом списке не только частные авто, но и транспорт, принадлежащий юридическим лицам. Из-за пьяных водителей два предприятия в Буда-Кошелевском и Калинковичском районах уже лишились своей техники, пишет onliner.by.

Так, в декабре прошлого года суд Буда-Кошелевского района признал виновным в совершении преступления, предусмотренного ч. 1 ст. 3171 Уголовного кодекса Республики Беларусь (управление транспортным средством лицом, находящимся в состоянии алкогольного опьянения, совершенное в течение года после наложения административного взыскания за такое же нарушение) работника ОАО «Экспериментальная база „Пенчин“». В ноябре мужчина был задержан за повторное управление в состоянии алкогольного опьянения трактором «Беларусь», принадлежащим данному предприятию. Перед тем как сесть за руль сельхозтехники, работник выпил литровую бутылку пива. Суд назначил наказание в виде исправительных работ по месту работы сроком на 1 год 6 месяцев с лишением права управления всеми видами транспортных средств сроком на 5 лет. Трактор, принадлежащий юридическому лицу, конфискован в доход государства.

Похожая ситуация произошла и с работником автохозяйства ОАО «Капличи». Ранее он уже привлекался к административной ответственности за отказ от прохождения освидетельствования на предмет определения состояния опьянения и даже был лишен водительского удостоверения. Но это не помешало администрации предприятия выписать на водителя путевой лист. Выехав на тракторе с мехдвора, работник первым делом направился в магазин. Позже его остановили госавтоинспекторы. Мужчина был пьян.

Суд приговорил водителя к одному году исправительных работ с лишением права заниматься деятельностью, связанной с управлением всеми видами транспортных средств сроком на 5 лет. Трактор предприятия ОАО «Капличи» конфискован, должностные лица также понесли соответствующее наказание.



А КАК ЖЕ ШВЕЙЦАРСКИЕ ЧАСЫ ЗА 37 ТЫСЯЧ ДОЛЛАРОВ?

Глава белорусского правительства Михаил Мясникович считает удовлетворительным качество белорусского продовольствия и заявляет, что предпочитает товары отечественных производителей.

«Я с удовольствием покупаю белорусскую продукцию. Рыбу, например, только «Санта-Бремор», «Белрыба» мне кажется хуже по качеству. Из молочных продуктов больше всего люблю «Савушкин». У меня есть костюмы белорусского производства, это «Коминтерн», и тот, что на мне сейчас, тоже сшит у нас. Рубашки белорусские, «Элиз» мне очень нравится, а производства Мозыря – похуже немного», - рассказал Мясникович в программе «Картина мира» на телеканале «РТР-Беларусь» в субботу, передает Интерфакс.

По словам главы правительства, ему также нравится и белорусская обувь. «К обуви белорусской от «Белвеста» и «Марко» у меня нет вопросов, хотя «Марко» я люблю больше», - добавил он.

Мясникович отметил, что многие известные в республике сегодня товары были созданы для того, чтобы заместить на рынке импортные аналоги. «У многих по поводу импортозамещения сегодня кривое зеркало в голове. Что можно напильником на коленке сделать что-то хорошее», - заметил Мясникович. Он добавил, что не поддерживает такую позицию.

По мнению главы правительства, продукция, выпускаемая на внутреннем рынке в рамках импортозамещения, должна по качеству не уступать импортной. Между тем, рассказал Мясникович, сегодня многие крупные белорусские производители считают возможным выпускать на внутренний рынок товары, которые существенно уступают по качеству экспортным партиям. «Если будет худшее качество, то зачем оно такое нужно? Это все в расчете, что будет бюджетная поддержка, а это иждивенчество и так быть не должно», - подчеркнул премьер-министр.

Однако известно, что слова Мясниковича расходятся с делом. Премьер предпочитает дорогие импортные товары. В конце 2012 года его сфотографировали на Минском инвенстиционном форуме в швейцарских часах Girard-Perregaux Vintage 1945 стоимостью 37 тысяч долларов.



ЗА ЧТО ПЛАТИМ?

Неэффективная модель госуправления оплачивается из карманов белорусов

Сегодня чиновники разных рангов оправдываются за экономические огрехи прошлых лет. От сельского хозяйства до деревообработки — все проходит через жернова постоянных совещаний на уровне главы государства. Чтобы понять масштабы бедствия, необходимо определить, во сколько на самом деле обходится текущая система государственного управления обычным белорусам, пишет Антон Болточко на сайте «Белорусские новости».

Определить объем затрат белорусов на содержание отечественного госменеджмента сложно по двум причинам: отсутствие полной, открытой информации и разнородность затрат, которые сложно подвергаются агрегированию. При этом, если принять во внимание некоторые упрощения анализа, то все затраты можно разделить на прямые и косвенные.



Под прямыми понимаются те, которые граждане несут в натуральном или денежном видах, напрямую выплачивая государству (например, налоги). Косвенные затраты — это упущенная выгода либо фактические потери от государственного управления в рамках экономической системы (например, стагнация или кризис в стране).

ЗАТРАТЫ 1. ШОКОВАЯ КОРРЕКТИРОВКА ДИСБАЛАНСОВ

Хотя по заверениям официальных лиц в стране царит пресловутая стабильность, обычные граждане видят другое. Последние годы экономические пертурбации стали просто напастью.

Проанализировав пятилетние программы социально-экономического развития Беларуси (на 1996-2000, 2001-2005, 2006-2010 годы и итоги выполнения за 4 года текущей программы на 2011-2015 годы) можно прийти к выводу, что первые три из перечисленных выше пятилеток по большинству показателей выполнялись. Однако при более внимательном изучении сложно говорить об успешности государственного управления с целью повышения уровня развития экономической системы Беларуси.

Во-первых, с целью экономического роста использовались сомнительные источники роста, которые давали краткосрочный эффект и в долгосрочной перспективе скорее являлись угрозой для экономического развития страны.

По итогам программы 1996-2000 годов еще можно было найти в официальных документах критический взгляд на такие источники. «Многие факторы, стимулировавшие экономический рост в начале пятилетия, в частности недоиспользованный производственный и научно-технический потенциал, политика денежной экспансии, жесткое регулирование цен, исчерпали себя. Вместе с тем обострились инфляционные процессы. Основная причина этого — денежно-кредитная политика 1998-1999 гг., связанная с опережающим эмиссионным кредитованием государственных программ в области жилищного строительства, а также последствиями августовского (1998 г.) финансового кризиса в России» — отмечалось в подведенных правительством итогах реализации программы социально-экономического развития Беларуси на 1996-2000 годы.

Однако в последующие годы содержание такого рода итогов сводилось скорее к перечислению достижений, чем критической оценке ситуации. При этом сомнительные источники роста (эмиссионное кредитование и т.п.) продолжают использоваться до сих пор.

Во-вторых, по итогам выполнения пятилетних программ наблюдался неравномерный рост тех или иных запланированных показателей. В то время как одни не выполнялись, другие перевыполнялись в 1,5 и более раз. Такого рода развитие в итоге сводилось к образованию в экономике дисбалансов, потребовавших корректировки в последующие годы (например, девальвации национальной валюты в начале 2009 года).

Итогом такого развития на протяжении почти четырех пятилеток стала большая экономическая корректировка в 2011 году, выраженная в девальвации национальной валюты втрое и инфляции в 108,7% (декабрь к декабрю). Последствия того экономического шока белорусы ощущают до сих пор. При такого рода событиях уровень жизни населения резко снижается, что уже можно считать фактическими затратами неэффективного государственного управления. Вдобавок из-за девальвации валюты и инфляции граждане страны несут денежные потери в виде обесценивающихся банковских вкладов.

ЗАТРАТЫ 2. НАЛОГИ: ЭКОНОМИКУ ОБДИРАЮТ КАК ЛИПКУ

Вторым видом затрат на госуправление, которые несет белорус, являются налоги. За период с 2004 по 2013



год бюджет страны, согласно данным Минфина, практически постоянно формируется из налоговых доходов, хотя тенденция снижения их доли наблюдается. Так, если в 2004 году доходы бюджета были сформированы из налоговых поступлений на 94,2%, то уже в 2011 году эта цифра снизилась до 90,9%. По предварительным данным, в 2013 году это значение подскочило на несколько процентов.

В 2010 году Всемирный банк в ходе мониторинга бюджетных расходов страны отметил, что «налоговая система Беларуси основывается на налогах на потребление и налогах на доходы». С учетом того, что структура налоговой системы за последние годы не претерпела серьезных изменений, такая характеристика остается актуальной.

С 2004 года налоговая нагрузка на экономику страны росла вплоть до кризисного 2008 года: увеличение нагрузки за этот период составило 5,4 процентного пункта. Однако с 2008 года нагрузка резко упала — до 35,7% ВВП по итогам 2011 года. В 2013 году старые позиции были восстановлены: примерно 40% ВВП были изъяты в виде налогов в пользу бюджета и Фонда социальной защиты населения.

ЗАТРАТЫ 3. ЧИНОВНИК ТРАНЖИРИТ

Согласно данным Минфина, через государственный бюджет перераспределяется от 35% до 45% ВВП страны. Максимальная доля бюджетных расходов наблюдалась в 2008 году (49,2%), в 2012 году показатель снизился до 40,0% ВВП. Однако уже в 2013 году наблюдается рост этого показателя до уровня 43% ВВП. При таком большом объеме проходящих через чиновников средств возникает упущенная выгода. Это происходит из-за более низкой эффективности распределения изъятых средств государством по сравнению с перераспределением этих средств в рамках экономической системы ее участниками самостоятельно.

Всемирный банк в ходе своих исследований подтвердил этот факт: «при расходах на уровне 35% ВВП и выше увеличение расходов сектора госуправления на 1 процентный пункт ВВП ведет к сокращению экономического роста на 0,3-0,4% в год».

Конечно же, это является усредненным показателем, и он может разниться в зависимости от структуры экономики и иных факторов. Однако мы можем воспользоваться этим данными для приблизительного расчета упущенных возможностей экономического роста в Беларуси. За 2013 год примерные потери ВВП Беларуси составили от 2,4% до 3,2%.

Можно выделить еще несколько статей затрат, которые ухудшают жизнь обычного белоруса.

Рост внешних долгов, которые используются для исправления ошибок государственного управления, рефинансирование банковской системы из-за ее низкой эффективности и многое другое — все это оплачивает обычный человек, который живет и пользуется услугами белорусского государства.

И, судя по итогам последних совещаний с участием Лукашенко, должных выводов из текущей ситуации наверху не делают. Это означает, что белорусу придется раскошеливаться на неэффективную систему управления и впредь.

ЧИНОВНИК: В ГОД ГОСТЕПРИИМСТВА БЕЛОРУСЫ ДОЛЖНЫ ЧАЩЕ УЛЫБАТЬСЯ

Такое мнение высказал первый заместитель министра спорта и туризма Александр Гагиев.

Об этом Александр Гагиев заявил БелТА.



«В Год гостеприимства мы должны максимально поработать над развитием туристической инфраструктуры в стране, сервиса и обслуживания, - считает Александр Гагиев. - Мы должны окружить каждого туриста заботой и вниманием. Хотя белорусам гостеприимства не занимать, но если мы научимся быть еще более приветливыми, доброжелательными, еще больше улыбаться - это будет способствовать созданию положительного имиджа о стране. При этом хотелось бы научить улыбаться наших милиционеров, работников общепита, медиков, то есть, чтобы Беларусь была привлекательна не только своей богатой историей, культурой, красотой природы, но и витающей здесь атмосферой доброжелательности и спокойствия».

По мнению первого замминистра, главным экзаменом на гостеприимство станет для Беларуси в мае чемпионат мира по хоккею.

«Одна из наших задач - обеспечить заполнение зрителями всех ледовых трибун, и мы в этом плане идем на рекорд. Думаю, мы его установим, продав около 600 тыс. билетов, в то время как на прошлом чемпионате мира по хоккею было реализовано около 560 тыс.», - сказал Александр Гагиев.Напомним, против проведения ЧМ по хоккею в Минске выступают многие европейские и американские политики, это связано с систематическим нарушением прав человека в Беларуси.

«ЗАЙЧИК» ПАДАЕТ УЖЕ ДВА МЕСЯЦА

На торгах Белорусской валютно-фондовой биржи 10 февраля доллар вырос на 10 рублей — до 9680 белорусских рублей. Доллар не снижается уже 87 дней подряд и 59 дней подряд растёт не более 10 рублей в сутки. С начала февраля курс доллара вырос на 40 рублей, а за последние 30 дней — на 140 рублей, передают «Белорусские новости».

Курс евро, в свою очередь, увеличился на 150 рублей всего за три последних дня торгов. Российский рубль понизился на 1,0 рубль — до 278,5 белорусских рублей.



Алесь НЯЎВЕСЬ

ЗЯЛЁНЫЯ ШТАНЫ ГАДЗЯЦЦА ДЛЯ ШПАНЫ

Наконт формы для нашых алімпійцаў Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Мне паказалі экіпіроўку, на што я адказаў, што апранаць яе не буду. Як прэзідэнт краіны будзе хадзіць у зялёных штанах? Добра, што не блакітныя, чэснае слова…»

Нам поспехаў Алімпіяды
Прыносяць — як наплакаў кот…
І тут ні ўзбучкі, ні загады
Не дададуць узнагарод.
І хоць падзей заўжды багата,
Па медалях складаем план,
Амаль як на «чужое свята»
Мы пазіраем на экран.
Калі расклад такі… хрэновы
І нам не свецяць медалі,
Да нечаканае высновы
Чыны спартыўныя прыйшлі:
«Няхай ніхто не пераможа,
Не ўчуем медалёвы звон,
Ды будзе выглядаць прыгожа
Там наш спартыўны легіён.
Каб розныя «месье» і «сэры»
Распазнавалі нас здалёк,
Дык пашчыруйце, мадэльеры!
Дызайнеры, напружце клёк!»
Што болей кідкае ў адзежы?
Пытанне ўзнікла для чыноў,
Якія колеры належыць
Абраць для куртак і штаноў.
Спярша абралі чорна-шэры.
— Паверце нам, што гэта дур, —
Пярэчыць сталі мадэльеры. —
Падобны колер — для хаўтур.
Забракавалі колер сіні,
Бо, парашылі, гэткі від
Больш падыходзіць для Расіі.
Дый геяў сімвалам — блакіт.
Палічыць Бацька, што ганебна…
Галоўны вынес свой прысуд:
— Ідэалогіяй патрэбна
Усім нам кіравацца тут.
Было б, бадай, зусім няблага
(Дый не супроць правадыры),
Каб форма мела колер сцяга.
— Дык іх жа там адразу тры!
Пачулі аргумент ягоны:
— Хай іх было б і цэлых пяць!
Вось толькі белы і чырвоны
Непажадана ужываць.
Няўцям дызайнерам знямелым…
— Ды не нажыць бы нам бяды:
Са сцягам бел-чырвона-белым
Нацдэмы носяцца заўжды!



Што застаецца нам? Зялёны.
Ён сакавіты, як трава.
І з-за таго, што незаконны,
Балець не будзе галава.
Ніхто не папракне ніколі,
Ад Бацькі будзе пахвала…
Зялёны — вось найлепшы колер,
Каб форма вабнаю была!
— Ды гэты ж колер мусульмане
Шануюць з даўняе пары…
— А хто зважаць на гэта стане?
Дый мусульмане нам — сябры…
Не падкапаешся як быццам,
Як быццам правільны намер…
Пашылі форму алімпійцам,
Няхай красуюцца цяпер!
А можа, выканаюць норму
Па медалях, бо шыку шмат.
Для пахвалы рашылі форму
Занесці Бацьку на агляд.
Дый форма акурат дарэчы
Дарункам будзе заадно,
Бо Бацька «не сядзіць на печы» —
На лыжах бегае даўно.
Няхай пацешыцца, рашылі,
Само, падзякі апрача,
Надзеліць прэміяй-грашыма
Ці «футрам з царскага пляча».
А Бацька раптам — вось дык дзіва! —
Дарунак згледзеўшы такі,
Раўнуў:
— Я што — за кракадзіла?
Вы звар'яцелі, мужыкі!
Вы з перапою? З перапуду?
Ці лічыце, што я дурны?
Я, прэзідэнт, і раптам буду
Насіць зялёныя штаны?
Дызайнеры і мадэльеры
Як абпляваныя пайшлі.
Цяпер адна надзея-вера —
Што ўсё-ткі будуць медалі…

* * *

Во ўжо ад Бацькі мелі б звягу
(Застаўся б гвалт на ўсе часы),
Каб падарылі, як на сцягу,
Яшчэ й з арнаментам трусы…

Старый замок

20(66) ФЕВРАЛЬ 2014



Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб., г. Быхаў, вул. Грышына 25-33, Тэл. 8 – (02231) 56-223, e-mail: nestor_mahno@tut.by. Выдавец Антонаў Сяргей Валянцінавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 20.02.2014 г. у 10-00.

Распаўсюджваецца бясплатна!

